МІНІСТЭРСТВА АБАРОНЫ
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

ГАЛОЎНАЕ ЎПРАЎЛЕННЕ
ІДЭАЛАГІЧНАЙ РАБОТЫ

вул. Камуністычная, 1
220034, Ф-2, г. Мінск,
тэл. (017) 297 16 51

МИНИСТЕРСТВО ОБОРОНЫ
РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

ГЛАВНОЕ УПРАВЛЕНИЕ
ИДЕОЛОГИЧЕСКОЙ РАБОТЫ

ул. Коммунистическая, 1
220034, Ф-2, г. Минск,
тэл. (017) 297 16 51

19.08.2009 г. № 6/13алир/92

Бяляцкаму А., Стэфановічу В.,
Лабковічу В.
220012, Мінск, праспект
Незалежнасці 78-а – 48.

Аб разглядзе звароту

У Міністэрстве абароны разгледжаны Ваш зварот і праведзена праверка па ўсёй інфармацыі, выкладзенай у ім.

Установлена наступнае.

Не адпавядаюць рэчаіснасці заявы аб тым, што Ф.В. Вячорка прыцягнуты да дысцыплінарнай адказнасці за выкарыстанне беларускай мовы.

Дысцыплінарнае спагнанне на радавога Вячорка Ф.В. накладзена не за ўжыванне ім беларускай мовы, а за нетактоўныя паводзіны са старэйшым па воінскім званні, няведанне і нежаданне выконваць патрабаванні агульнавайсковых статутаў Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь.

Прызыў у войска Ф.В. Вячоркі і іншых пералічаных Вамі вайскоўцаў ажыццёўлены ў поўнай адпаведнасці з заканадаўствам, што пацвярджаецца некалькімі праверкамі ў папярэдні перыяд.

Паводле артыкула 4 Закона Рэспублікі Беларусь "Аб воінскім абавязку і воінскай службе" воінскі абавязак выконваюць грамадзяне незалежна ад роду і характару заняткаў, палітычных і іншых перакананняў. Сцвярджэнне пра прызыў у войска дадзеных вайскоўцаў у сувязі з іх актыўнай грамадска-палітычнай дзейнасцю не адпавядае рэчаіснасці.

Таксама не адпавядае рэчаіснасці сцвярджэнне аб тым, што на Ф.В. Вячорку і іншых вайскоўцаў аказваецца ціск у сувязі з выкарыстаннем імі беларускай мовы.

Установлена, што ніхто з службовых асоб не дапускаў некарэктных выразаў у адрас беларускай мовы. Адпаведна, прыведзеныя ў якасці

прыкладу словазлучэнні ("говори на нормальном языке" і іншыя) не дапускаліся службовымі асобамі падраздзялення, дзе служыць Ф.В. Вячорка.

Не адпавядае рэчаіснасці сцвярджэнне аб ігнараванні Міністэрствам абароны "існавання другой дзяржаўнай мовы". Па-першае, ваеннае ведамства ніколі не лічыла беларускую мову другой мовай. Калі казаць пра дзяржаўныя мовы, то яны маюць абсалютна аднолькавы статут, але першай, несумненна, з'яўляецца беларуская мова. Па-другое, менавіта Міністэрствам абароны ініцыяваны працэс шырокага ўкаранення ва Узброеных Сілах беларускай мовы.

Менавіта Міністэрствам абароны шырока разрэкламаваны баявыя дакументы на беларускай мове, якія выдаваліся ў дваццатых гадах мінулага стагоддзя. Так, у кнізе «Вооруженные Силы Республики Беларусь. 90 лет на страже Отечества», якая ёсць практычна ў кожнай бібліятэцы, прадстаўлены, напрыклад, Загад Рэвалюцыйнага Ваеннага савету СССР 2 красавіка 1927 г. № 182 і "Баявы статут пяхоты РСЧА", выданне 1927 г.

Добра вядома, што элітным падраздзяленнем беларускага войска з'яўляецца рота ганаровай варты, якая выконвае найважнейшыя дзяржаўныя задачы, прадстаўляючы нашу краіну на міжнародным узроўні. Прынцыпова важна, што прывітальны даклад камандзіра роты ганаровай варты ў гонар прыбыцця пачэсных гасцей і дэлегацый ажыццяўляецца толькі на беларускай мове.

Дарэчы, надпісы на ўсіх Баявых сцягах воінскіх часцей, на ардэнах, геральдычных сімвалах і знаках Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь, ганаровых граматах выкананы толькі на беларускай мове.

На канцэртах, якія арганізуе ваеннае ведамства, колькасць песень на беларускай мове перавышае 50%.

Такім чынам, абвінавачванні вайсковага ведамства ў ігнараванні дзяржаўнай мовы, а тым больш праследаванні вайскоўцаў за выкарыстанне беларускай мовы, неабгрунтаваныя.

Паводле артыкула 20 Закона Рэспублікі Беларусь "Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь" ва Узброеных Сілах, іншых вайсковых фарміраваннях Рэспублікі Беларусь ужываюцца беларуская і (або) руская мовы. Такім чынам, ужыванне рускай мовы, як пры падачы каманд, так і пры выкананні страявых песень у пэўным воінскім падраздзяленні па рашэнні адпаведнага камандзіра (начальніка) цалкам правамерна і не супярэчыць заканадаўству.

У адпаведнасці з артыкулам 242 Статуту ўнутранай службы падчас вячэрняй прагулкі асабовы склад выконвае страявыя песні ў складзе падраздзяленняў.

У рэпертуары страявых песень ва Узброеных Сілах Рэспублікі Беларусь ёсць песні як на беларускай, так і на рускай мовах.

Пры гэтым вайсковым ведамствам усяляк заахвочваецца выкананне страявых песень на беларускай мове. Невыпадкова на ўсіх парадах войскаў Мінскага гарнізона зводным аркестрам выконваюцца песні толькі на беларускай мове. Так, 3 ліпеня 2009 года на парадзе войскаў у гонар 65-годдзя вызвалення Беларусі аркестрам выконвалася песня Я. Доўжыка на словы Л. Якаўлева "Народнай арміі салдаты", у 2008 годзе – песня А. Фёдарава на словы Л. Залескай «Айчыны нашай сцяг».

Разам з тым, калі ў пэўным воінскім падраздзяленні па рашэнні адпаведнага камандзіра (начальніка) выконваецца песня на рускай мове, то дэманстратыўная адмова ад яе выканання адным з вайскоўцаў (у дадзеным выпадку Ф.В. Вячоркам) з'яўляецца не чым іншым, як відавочнай адмовай ад выканання загада начальніка, здзейсненая ў страі і перад строем.

Прычым відавочна абуральныя дзеянні Ф.В. Вячоркі складаліся не толькі ў адмове ад выканання песні ў складзе падраздзялення, але і ў пагрозах у адрас службовай асобы – дзяжурнага па часці.

Такім чынам, канфліктная сітуацыя, якую беспадстаўна спрабуюць прадставіць як ціск на вайскоўца ў сувязі з ужываннем ім беларускай мовы, справакавана самім Ф.В. Вячоркам, дэманстратыўныя дзеянні якога адначасова накіраваны на штучнае проціпастаўленне дзвюх дзяржаўных моў, гэта значыць пропаведзь варожасці на моўнай глебе, што з'яўляецца парушэннем артыкула 6 Закона Рэспублікі Беларусь "Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь". Прычым устаноўлена, што радавы Вячорка Ф.В. у поўнай меры валодае як беларускай, так і рускай мовамі. Напрыклад, у атэстаце аб сярэдняй адукацыі ў яго досыць высокія адзнакі (сем) па рускай і беларускай мовах.

Таму дзеянні службовых асоб цалкам адпавядалі дзеянням у выпадку парушэння воінскай дысцыпліны падначаленным вайскоўцам. Спробы прадставіць іх як ціск на вайскоўца ў сувязі з ужываннем ім беларускай мовы, неабгрунтаваныя.

Растлумачваю Вам, што Вы, на падставе артыкула 14 Закона Рэспублікі Беларусь "Аб зваротах грамадзян", маеце права абскардзіць рашэнне, прынятае па Вашым звароце, у вышэйстаячыя дзяржаўныя органы, іншыя арганізацыі (вышэйстаячым службовым асобам) і (або) у суд.

Выконваючы абавязкі памочніка Міністра абароны па ідэалагічнай рабоце ва Узброеных Сілах – начальніка галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы Міністэрства абароны
палкоўнік У.М.Макараў